гамі паскідвалі ў прыгатаваную магілу дзяцей і далі па іх некалькі чэргаў. Дзеці, якія знаходзіліся на дне ямы, яшчэ заставаліся жывымі. Але фашысты загадалі засыпаць яму.

Паводле афіцыяльных даных, гітлераўцы ў Беларусі расстралялі, закатавалі, павесілі, спалілі жывымі і задушылі ў «газавых камерах» (душагубках) больш 2,2 млн. савецкіх грамадзян. Каля 380 тыс. было выгнана ў Германію, многія з іх загінулі. Новыя, больш удакладненыя звесткі даюць магчымасць гаварыць аб тым, што людскія страты рэспублікі былі значна большымі: не менш 2,8—3 млн. чалавек [9].

Злачынствы, якія планавалі і здзяйснялі фашысты на акупіраванай савецкай зямлі, па масавасці, планамернасці, вытанчанасці гістарычна беспрэцэдэнтныя. Паводле даных Інстытута ваеннай гісторыі бундэсвера ФРГ, да 1 лютага 1942 г. загінула 60 % нашых палонных, захопленых фашыстамі ў 1941 г. Усяго за час вайны ў фашысцкіх лагерах і турмах было закатавана або пакарана каля 5 млн. савецкіх патрыётаў.

Сёння нават цяжка ўявіць, якімі былі б вынікі крывавых злачынстваў, калі б не гераічная барацьба ўсяго савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на фронце, у партызанскіх атрадах, у падполлі, калі б не самаадданая праца ў тыле, адзінства народаў усёй краіны. Савецкая Армія знішчыла фашызм, не дала яму ператварыцца ў рэжым каланізацыі.

[1] Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1983. Т. 1. С. 167.

[2] Гл.: Безыменский Л. А. Генеральны план «Ост»: замысел, цели, результаты // Вопросы истории. 1978. № 5. С. 78; ЦГАОР СССР. Ф. 7445, оп. 2, д. 163, л. 433—443 // Пер. с нем.

[3] Безыменский Л. А. Указ. соч. С. 82—83.

[4] Гл.: Преступные цели — преступные средства: Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941—1944 гг.). М., 1985.

[5] Гл.: Всенародная борьба в Белоруссии... Т. 1. С. 168.

[6] Гл.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941—1945): Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 291—292.

[7] Преступные цели — преступные средства... С. 103—105.

[8] Гл.: Всенародная борьба в Белоруссии... Т. 2. С. 38.

[9] Гл.: Звязда. 1991. 15 студзеня.

У. П. ПАЎЛАЎ

# НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ РАБОТНІКІ — УДЗЕЛЬНІКІ МІНСКАГА ПАДПОЛЛЯ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

З першых да апошніх дзён акупацыі Мінска гітлераўцамі інтэлігенцыя горада заставалася адданай свайму народу, вызначала сваё месца ў агульным страі барацьбітоў падполля з фашызмам. Падпольныя групы ўзнікалі ў розных месцах горада.

Група, якой кіравала В. Ф. Мацюшка, былы намеснік дырэктара навукова-даследчага інстытута харчовай прамысловасці БССР, склалася летам 1941 г. У яе састаў уваходзіў камуніст Л. Д. Казючыц, іншыя саслужыўцы Веры Феафанаўны па інстытуту. Кватэра кіраўніка стала явачнай кватэрай падпольшчыкаў. Камсамолец Ф. Пяско не здаў ваенным уладам радыёпрыёмнік і ўстанавіў яго ў падвале дома № 29 па вуліцы Энгельса. Патрыёты слухалі і запісвалі сводкі Саўінфармбюро, якія распаўсюджвалі сярод насельніцтва. У лістоўках, што з'яўляліся раніцай на платах і дамах, яны заклікалі да барацьбы з фашыстамі. Члены групы збіралі таксама зброю, якая перадавалася ў партызанскую брыгаду В. Т. Варанянскага.

У сакавіку 1942 г. паліцыя бяспекі і СД нанеслі мінскаму падполлю цяжкі ўдар. Гітлераўцам удалося высачыць і арыштаваць многіх актыўных падпольшчыкаў. Вораг разлічваў, што пасля знішчэння «падпольных завадатаяў», як яны пісалі, спыніцца ўсялякая барацьба ў горадзе. Але месцы загінуўшых займалі новыя людзі. Гэта былі энергічныя, смелыя, таленавітыя арганізатары.

У пачатку мая 1942 г. на кватэры В. Ф. Мацюшка адбылося пасяджэнне падпольнага гаркома партыі. На ім было прынята рашэнне аб стварэнні ў Мінску пяці падпольных райкомаў. Крыху пазней былі створаны і шосты. Гаспадыня кватэры стала намеснікам сакратара Варашылаўскага райкома

КП(б)Б. У канцы мая на яе кватэры адбылося чарговае пасяджэнне КП(б)Б, дзе сярод іншых пытанняў абмяркоўвалася і пытанне аб выпуску газеты «Звязда»[1].

Мінчане ніколі не забудуць светлае імя палымянага патрыёта, прафесара Яўгена Уладзіміравіча Клумава (падпольная мянушка «Самарын»), які не толькі лячыў і выратоўваў жыццё савецкіх патрыётаў, але і сістэматычна забяспечваў партыйнае падполле, партызанскія атрады каштоўнымі медыкаментамі, хірургічнымі інструментамі, прэпаратамі. У адным з данясенняў савецкага разведчыка з Мінска ў верасні 1943 г. аб гэтым гаворыцца так: «Самарын. Палымяны барацьбіт з фашысцкімі захопнікамі. Уключыўся ў актыўную работу з пачатку 1942 г. Вельмі многа медыкаментаў перадаў у распараджэнне народных мсціўцаў, абслугоўваў чатыры атрады. Поўнасцю абсталяваў два палявыя шпіталі, праз тав. Самарына можна было дастаць самыя дэфіцытныя і самыя важныя медыкаменты»[2]. У падпольнай дзейнасці ўдзельнічала і жонка прафесара — Г. Н. Клумава.

Кватэра патрыётаў знаходзілася на тэрыторыі цяперашняй 3-й бальніцы. Тут жа жыў і дацэнт-метэаролаг В. Анісімаў. Разам яны хавалі радыёпрыёмнік у печы, прымалі зводкі Саўінфармбюро, распаўсюджвалі іх сярод медыцынскіх работнікаў.

Восенню 1943 г. Я. У. Клумаў быў схоплены гітлераўцамі. Пагрозамі і пасуламі гестапаўцы спрабавалі прымусіць яго працаваць на акупантаў. Савецкі патрыёт з абурэннем адхіліў намаганні фашыстаў. Ён застаўся да канца адданым свайму народу. У сакавіку 1944 г. гітлераўскія каты пакаралі Я. У. Клумава і яго жонку. Пасмяротна прафесару Я. У. Клумаву прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Разам з Я. У. Клумавым у бальніцы працавалі і адважны патрыёт прафесар І. А. Вятохін, акадэмік АН БССР Д. А. Маркаў. Перад вайной Данііл Аляксандравіч доўгі час узначальваў кафедру нервовых хвароб Мінскага медінстытута, у 1940 г. ён быў выбраны правадзейным членам Акадэміі навук БССР. У гады акупацыі загадваў кабінетам неўрапаталогіі. Па яго «даведках» удалося выратавацца ад вывазу ў Германію многім падпольшчыкам і жыхарам горада, ён даваў кваліфікаваныя кансультацыі ўрачам-патрыётам па розных пытаннях, забяспечваў падпольшчыкаў лекамі, перавязачным матэрыялам [3].

У групе М. Б. Осіпавай (падпольная мянушка «Чорная»), якая працавала да вайны заг. кабінета гісторыі КПСС юрыдычнага інстытута, змагаўся з ворагам прафесар І. Г. Некрашын, «ўладкаваўшыся» на работу ў нямецкую службу надвор'я. Гэта давала яму магчымасць выяўляць варожыя лакатары, радыёстанцыі, іншыя варожыя аб'екты і дакладна наносіць іх на карту.

У гэтай жа групе быў і яшчэ адзін беларускі вучоны — Н. Н. Крэчатовіч, дацэнт політэхнічнага інстытута, вядомы энергетык. Ён уладкаваўся працаваць электраманцёрам у гарадскую ўправу, змог падабраць ключы да сейфаў, дзе захоўваліся бланкі пашпартаў і іншыя патрэбныя падпольшчыкам дакументы, і забяспечваў імі групу. Надзейныя дакументы дапамаглі выратаваць ад расправы шмат ваеннапалонных і яўрэяў. Як электраманцёр Н. Н. Крачатовіч меў права заходзіць у любы пакой. У час службы ён прыглядаўся да людзей, слухаў іх размовы з начальствам. У гэтым яму дапамагала веданне нямецкай мовы. Хутка Н. Н. Крэчатовіч стаў майстрам па рамонту радыёпрыёмнікаў, і акупанты неслі яму на рамонт свае апараты. Гэта давала магчымасць слухаць радыё, прымаць зводкі Саўінфармбюро, якія перапраўляліся на Заслаўскую вуліцу да «Чорнай». Там яны ператвараліся ў лістоўкі, што неслі людзям праўду аб становішчы на франтах Вялікай Айчыннай вайны, надавалі ім сілы, умацоўвалі ўпэўненасць у перамозе над ворагам [4].

Вялікую ролю ў дзейнасці мінскага падполля адыграла дацэнт Мінскага медыцынскага інстытута Е. Т. Станкевіч. Па заданню кіраўніцтва яна пачала працаваць у гарадской управе. Разам з сяброўкай, супрацоўніцай медінстытута Л. Ф. Густарнік-Ларынай яна забяспечвала партызан медыкаментамі, хірургічным абсталяваннем. Карыстаючыся сваім становішчам, Станкевіч магла рабіць перастаноўку медыцынскіх работнікаў у неабходных для падпольшчыкаў мэтах. З яе дапамогай кандыдат медыцынскіх навук дацэнт медінстытута Д. С. Рыдлеўскі і асістэнт Н. А. Рэут уладкаваліся на работу ў чыгуначную бальніцу. У лячэбнай установе пры іх дапамозе былі ўстаноўлены два радыёпрыёмнікі. Рыдлеўскі, Рэут і іх памочнікі запісвалі зводкі Саўінфармбюро, якія распаўсюджваліся сярод насельніцтва. Яны аперыравалі і лячылі раненых партызан і падпольшчыкаў, забяспечвалі ўцек-

шых з палону савецкіх ваеннаслужачых дакументамі, перапраўлялі патрыётаў у партызанскія атрады [5].

Вялікіх намаганняў патрабавала стварэнне матэрыяльнай базы падполля. Яго ўдзельнікі з актыўнай дапамогай насельніцтва рознымі шляхамі здабывалі зброю, боепрыпасы, узрыўчатку, радыёпрыёмнікі і сілкаванне да іх, друкарскія шрыфты, фарбу і паперу для выпуску падпольнай літаратуры, медыкаменты, перавязачны матэрыял, медыцынскія інструменты, пішучыя машынкі, адзенне, абутак, харчаванне і г. д. Усё гэта з рызыкай для жыцця дастаўлялася на канспіратыўныя кватэры, у спецыяльна абсталяваныя тайнікі, каб затым выкарыстаць у сваёй рабоце або пераправіць у партызанскія атрады. Трэба адзначыць актыўную дзейнасць групы пад кіраўніцтвам дацэнта Камуністычнага інстытута журналістыкі Т. А. Зарубіна. Працуючы па заданню падпольшчыкаў у картачным бюро гарадскога камісарыята, Т. А. Зарубін і яго таварышы забяспечвалі хлебнымі і харчовымі карткамі членаў падпольнай арганізацыі, іх сем'і, сувязных партызанскіх атрадаў, а таксама сем'і партызан, якія жылі ў Мінску [6].

Важнейшай умовай паспяховай дзейнасці падполля было ўстанаўленне пастаянных сувязей з вышэйстаячымі партыйнымі органамі. Гэта пытанне стаяла ў цэнтры ўвагі Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б. Вяліся настойлівыя пошукі і прымаліся неаднаразовыя спробы ў гэтым напрамку. Адна з чарговых спроб увянчалася поспехам. Восенню 1942 г. гарком партыі накіраваў для пошуку падпольнага абкома КП(б)Б і ўстанаўлення з ім сувязі падпольшчыц А. А. Язубчык і Х. М. Прусліну. Пераадолеўшы вялікія цяжкасці, 11 верасня 1942 г. яны прыбылі ў Любанскі раён і даставілі абкому справаздачу падпольнага гаркома партыі [7].

Адным з важных бакоў дзейнасці Мінскага падполля была разведка. Вопытнымі разведчыкамі, якія аказалі вялікую дапамогу падполлю, партызанам і Чырвонай Арміі, былі дацэнты Белдзяржуніверсітэта Я. М. Зубковіч і А. В. Вязовіч. Асабліва вынікова працаваў Я. М. Зубковіч (падпольная мянушка «Зеўс»). У свой час ён служыў у арміі, быў штабным камандзірам і добра ведаў не толькі, якія звесткі патрэбны для разведкі, але і як здабываць іх, шыфраваць, каб у выпадку небяспекі праціўнік не здагадаўся, што мае справу з шыфрам. Таму разведвальныя даныя, перададзеныя Зубковічам, былі заўсёды важкія, дакладныя, аператыўныя. Паводле яго даных савецкая авіяцыя не раз бамбіла ваенныя аб'екты праціўніка ў Мінску і прыгарадах.

Пасля таго, як народнымі мсціўцамі быў знішчаны гаўляйтэр Вільгельм Кубэ, Я. М. Зубковіч устанавіў няспыннае назіранне за новым генеральным камісарам Беларусі фон Готбергам для таго, каб забіць і яго. І толькі няўдалы падбор выканаўцы гэтай аперацыі перашкодзіў яе паспяховаму ажыццяўленню [8].

Смелым і ініцыятыўным разведчыкам быў выкладчык замежных моў Белдзяржуніверсітэта А. П. Сямёнаў, які стаў асабістым перакладчыкам шэфа Мінскага чыгуначнага вузла. У канцы красавіка — пачатку мая 1943 г. у Цэнтр на Вялікую зямлю было перададзена здабытае А. П. Сямёнавым паведамленне аб тым, што ў горадзе ля чыгуначнага пераезда праз вуліцу Карла Маркса стаяць 12 таварных вагонаў з атручвальнымі рэчывамі. Ім жа былі выяўлены склады хімічных снарадаў на тэрыторыі клінічнага гарадка.

А. П. Сямёнаў вызначаўся высокай інтэлігентнасцю і таму карыстаўся даверам свайго шэфа. Узброены веданнем шасці моў, ён лёгка знаёміўся з замежнымі служачымі і рабочымі на чыгунцы, правяраў і ўдакладняў здабытыя звесткі.

У чэрвені 1943 г. А. П. Сямёнаў звярнуў увагу на дзіўную перамену ў грузапатоку па магістралях, якія ішлі з Мінска. Пераважная большасць нямецкай тэхнікі і боепрыпасаў ішлі на Гомель, а не на Смаленск. У супастаўленні з іншымі звесткамі, а таксама падслуханымі размовамі штабных афіцэраў аб мяркуемым удары на поўдзень ад Раслаўля і Бранска — гэтыя звесткі былі вельмі важнымі і тэрмінова перададзены камандаванню Чырвонай Арміі.

Важным перадатачным звяном звестак ад А. П. Сямёнава і іншых падпольшчыкаў партызанам была явачная кватэра ў Лошыцы-1, якую трымалі муж і жонка Ладысевы. Да вайны Д. І. Ладысеў працаваў навуковым супрацоўнікам у адным з інстытутаў АН БССР. Дзякуючы іх смелай дзейнасці ў партызанскія атрады было перапраўлена шмат каштоўнай інфармацыі, сувязных падполля. Але самому Д. І. Ладысеву выратавацца не ўдалося: ужо напярэдадні вызвалення Мінска ахранка высачыла мужа і жонку

і арыштавала іх. Страшныя пакуты выцерпелі яны на допытах у СД. Д. І. Ладысева фашысты расстралялі ў Трасцянцы [9].

Многа прозвішчаў і спраў патрыётаў Мінскага падполля яшчэ невядома нам, іх трэба ўстанавіць, якіх бы намаганняў гэта ні каштавала. Народ павінен ведаць усіх герояў, што ахвяравалі сваім жыццём у імя шчаслівай будучыні нашчадкаў.

[1] Гл.: Партийное подполье в Белоруссии 1941—1944: Страницы воспоминаний. Минская область и Минск. Мн., 1984. С. 176—184; Савицкая Я. М. Бойцы подпольного фронта. Мн., 1982. С. 58, 60, 108, 120.

[2] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 3963, воп. 1, спр. 13, арк. 55.

[3] Гл.: Вечерний Минск. 1973. 17 декабря.

[4] Гл.: Перминов С. И. Верность долгу. Документальные повести. М., 1982. С. 14—15; Люди легенд: Очерки о партизанах и подпольщиках — Героях Советского Союза. М., 1968. Вып. 3. С. 290.

[5] Гл.: Красовский Н. И. Высшая школа Советской Белоруссии. Мн., 1972. С. 149—150.

[6] Гл.: Подвиги их бессмертны: О подпольной борьбе советских людей в захваченных фашистами-оккупантами городах и селах Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944). Мн., 1978. С. 46.

[7] Там жа. С. 47.

[8] Гл.: Новиков И. Г. Бессмертие Минска. С. 189—190.

[9] Гл.: Калинин Ф. А. Центр вызывает Минск. Мн., 1973. С. 77, 79. 110.

М. М. ПАРХІМОВІЧ

## НОВАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ: НА ПАЧАТКУ ШЛЯХУ

Першая сусветная і грамадзянская войны, іншаземная інтэрвенцыя нанеслі значныя страты сельскай гаспадарцы Беларусі. Пасяўная плошча скарацілася да 40 %, на 50 % паменшылася ўраджайнасць, напалову — пагалоў'е жывёлы. Неадкладная і рашучая дапамога сялянству стала ўмовай уздыму сельскай гаспадаркі, існавання Савецкай улады.

Пераход да нармальных гаспадарчых адносін паміж горадам і вёскай у абставінах палітыкі «ваеннага камунізму», якую бальшавікі праводзілі ў 1918—1920 гг., быў немагчымы. Аднак не бальшавікі вынайшлі яе. Асобныя элементы гэтай палітыкі былі ўласцівы ўсім краінам, якія ўдзельнічалі ў першай сусветнай вайне. Самі абставіны крызісу, народжанага вайной і рэвалюцыйнымі падзеямі 1917 г., выклікалі да жыцця «ваенны камунізм» у Расіі. У дзяржавах, удзельніцах сусветнай вайны, рэгрэсіўныя бакі гэтай палітыкі пры пераходзе да мірнага развіцця паступова адміралі. У Расіі ж яны былі ўзмоцнены новай вайной. Да гэтага неабходна прыбавіць яшчэ адну асаблівасць расійскага «ваеннага камунізму». Сутнасць яе ў тым, што многія вымушаныя вайной меры і метады вядзення гаспадаркі ў 1918 г. разглядаліся бальшавікамі, у тым ліку і У. І. Леніным, як матэрыяльная падрыхтоўка сацыялізму. Аб гэтым сведчаць заявы многіх бальшавіцкіх лідараў, якія зроблены імі ў 1921—1922 гг.

Харчразвёрстка з'яўлялася адным са звенняў палітыкі «ваеннага камунізму». Яна не магла быць стымулам для гаспадарчай зацікаўленасці сялянства і выклікала яго незадаволенасць. Аднак ва ўмовах вайны яно яшчэ мірылася з гэтай мерай, таму што супроцьлеглы ў грамадзянскай вайне бок рабіў тое ж самае, што і бальшавіцкі ўрад.

Але вёска балюча адчула цяжар харчразвёрсткі, калі ваенныя хмары развеяліся. Селянін цяпер хацеў толькі аднаго: свабодна распараджацца атрыманай зямлёй і выпрацаванымі прадуктамі. Сацыяльная напружанасць у грамадстве патрабавала ад бальшавіцкай партыі неадкладна шукаць выйсце з крызіснай сітуацыі.

У даных абставінах Камуністычная партыя прапанавала новую эканамічную палітыку, якая павінна была забяспечыць «правільнае і спакойнае вядзенне гаспадаркі на аснове больш свабоднага распараджэння земляробам сваімі гаспадарчымі рэсурсамі, для ўмацавання сялянскай гаспадаркі і павышэння яе прадукцыйнасці» [1].

Першыя крокі Кампартыі Беларусі па ажыццяўленню нэпа ў вёсцы мелі агітацыйна-прапагандысцкі характар. 24 сакавіка 1921 г. ЦК КП(б)Б, разгледзеўшы пытанне «Аб справаздачы аб X з'ездзе Расійскай Камуністыч-